http://edoc.bseu.by



**В. М. ЛЯНЦЭВІЧ**

# *ПРАВАВОЕ РЭГУЛЯВАННЕ ПАЗЯМЕЛЬНЫХ АДНОСІН НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ У ПРЫВІЛЕЙНЫ ПЕРЫЯД (XIV — ПЕРШАЯ ПАЛОВА XVI СТ.)*

У артыкуле на падставе аналізу агульназемскіх прывілеяў XIV—XVI стст., а таксама іншых крыніц права Вялікага княства Літоўскага вызначаецца ўзрастаючая роля дзяржавы ў прававым рэгуляванні пазямельных адносін.

**Ключавыя словы:** прывілей; шляхта; магнаты; вотчына; умоўнае землеўладанне; дамен; гаспадарскія двары; фальварак; гаспадарчыя ўставы; «валочная памера».

**УДК** 433

Актуальнасць даследавання абумоўлена важнасцю тэарэтычнага асэнсавання гістарычнага вопыту рэгулявання пазямельных адносін у нашай краіне з боку дзяржавы, што неабходна ўлічваць пры ажыццяўленні сучаснай дзяржаўнай палітыкі ў зямельных праваадносінах. Зямельнае права на Беларусі набывае агульнадзяржаўны характар напачатку XVI ст., але да гэтага часу спатрэбіўся даволі значны перыяд, на працягу якога пастумова ўзрастала роля дзяржавы ў рэгуляванні феадальнага землеўладання, закладзенага ў эпоху першых дзяржаваў-княстваў (IX—XII стст.). З другой паловы XII ст. адзначаецца працэс актыўнага росту індывідуальнай зямельнай уласнасці, і менавіта зямля становіцца асноўнай крыніцай атрымання даходаў фарміруючагася феадальнага саслоўя. Гэта абумоўлівае і рост буйнога, у тым ліку і княжацкага, землеўладання. Ужо ў другой палове XII ст. буйное землеўладанне склалася ў значную эканоміка-палітычную арганізацыю [1, с. *26*].

Асноўнай крыніцай права на беларускіх землях з XV ст. становіцца пісанае права. Яно фармавалася на аснове мясцовага звычаёвага права, «Рускай праўды», а таксама нарматыўных актаў дзяржаўнай улады. Перыяд актыўнага развіцця феадальных адносін на беларускіх землях прадстаўлены рознымі прававымі актамі: вялікакняскімі абласнымі і валаснымі прывілеямі, соймавымі пастановамі («ухваламі»), гаспадарскімі лістамі і статутамі, судовымі рашэннямі розных інстанцый. Публікацыі гэтых крыніц, выкарыстаныя ў артыкуле, утрымліваюцца ў шэрагу выданняў [2—5].

У перыяд фармавання тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага і ўключэння ў яго склад усіх беларускіх зямель, які прыйшоўся на дыярхію Альгерда і Кейстута (1345—1377), кожны рэгіён Беларусі (Панямонне, Падзвінне, Падняпроўе, Палессе, Пасожжа, інш.) складваўся як адзінае эканамічнае цэлае. Статутныя земскія граматы, вядомыя з часоў Вітаўта (1392—1430), замацоўвалі дзяржаўна-прававы статус асобных беларускіх зямель. Усталёўваецца вярхоўная ўласнасць вялікага князя на ўсе землі дзяржавы. У той жа час з'яўляюцца і актыўна развіваюцца гаспадарскія двары, якія знаходзіліся ў асабістай уласнасці манарха.

*Вольга Міхайлаўна ЛЯНЦЭВІЧ* (liantsevich.volga@yandex.ru), *кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі права Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта (г. Мінск, Беларусь).*

XIII—XIV стст. — гэта перыяд складання саслоўнай структуры феадальнага грамадства, што таксама звязана з пазямельнымі адносінамі. Ідзе працэс фарміравання буйнога прыватнага землеўладання, якое канцэнтруецца ў руках ўдзельных князёў — нашчадкаў старадаўніх княжацкіх родаў, якія маглі распараджацца сваімі землямі, валодалі судовым імунітэтам і адміністрацыйнымі паўнамоцтвамі, актыўна ўдзельнічалі ў палітычным жыцці дзяржавы. Разам з княжацкім актыўна пашыраецца і баярскае (панскае, магнацкае) землеўладанне. Буйныя магнацкія роды з'яўляюцца нашчадкамі родавых старэйшын эпохі Кіеўскай Русі, аднак ужо ў перыяд барацьбы з крыжакамі яны ўзначальваюць ваенныя атрады. Пры гэтым права свабоднага распараджэння сваімі землямі першымі, у адпаведнасці з Прывілеем Ягайлы 1387 г., атрымалі феадалы літоўскага паходжання, якія прынялі каталіцкую веру [2, с. *40—42*]. Гэта права было замацавана Гарадзельскім прывілеем Вітаўта 1413 г. (§ 3, 12—15) [4, с. *212—214*], а затым распаўсюдзілася і на феадалаў праваслаўнага веравызнання па ўсёй тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага, якіх на беларускіх землях было большасць. Разам з афармленнем права зямельнай уласнасці адбываецца пашырэнне магнацкага землеўладання, нават за кошт гаспадарскіх двароў. Магнаты выступаюць супраць раздач зямель замежнікам і разам з эканамічным ўмацоўваюць і свой палітычны ўплыў у Вялікім княстве Літоўскім. Гэта было юрыдычна замацавана Прывілеем Жыгімонта I Старога (7.12.1506) [2, с. *54—57*].

Гарадзельскі прывілей 1413 г. паклаў пачатак юрыдычнаму афармленню шляхецкага ўмоўнага землеўладання: усе выгоды, дараваныя абмежаванаму колу ў 1378 г., распаўсюджваліся на ўсіх літоўскіх баяр, якія прынялі каталіцкую веру і запісаліся ў польскія гербавыя брацтвы (§ 3). У дакуменце таксама ёсць указанне на новы для Княства тып землеўладання — «гаспадарскую даніну» (§ 4), якая замацоўвалася за трымальнікам спецыяльным гаспадарскім лістом. Па Гродзенскаму 1432 г. і Трокскаму 1434 г. (§ 2) агульназемскіх прывілеях, правы і вольнасці, гарантаваныя Прывілеем 1413 г., пашыраліся на ўсіх феадалаў Княства [4, с. *217*]. Шляхта, якая такім чынам стала афармляцца ў асобнае службовае саслоўе, вызвалялася ад усіх падаткаў на карысць Вялікага князя і павінна была несці вайсковую службу. Прывілей Казіміра Ягелончыка 1447 г. [5, с. *24—27*] стаў пачаткам шырокіх раздач умоўных зямельных трыманняў і ўмацавання статусу шляхецкага саслоўя. Ён замацаваў за шляхціцамі, якія мелі адпаведныя дакументы ці паказанні сведак, маёнткі і отчыны, якія былі ім падараваныя Вітаўтам і Жыгімонтам Кейстутавічам (§ 6). Усе зямельныя падараванні з гэтых часоў Вялікі князь павінен быў узгадняць з паны-радай. І хоць зямельныя раздачы маглі ажыццяўляць таксама ўдзельныя князі, было такое права і ў княскіх намеснікаў і старастаў, яны павінны былі атрымаць пацверджанне ад гаспадара [1, с. *118—121*].

Юрыдычна паняцце аб праве прыватнай зямельнай уласнасці стала афармляцца толькі ў канцы XV ст. [4, с. *45*], калі ў крыніцах згадваюцца першыя судовыя працэсы аб парушэнні зямельных межаў [3, т. 1, с. *86, 101, 185*]. Пры слабой заселенасці тэрыторый княства раней не было патрэбы ва ўстанаўленні фіксаваных межаў паміж асобнымі ўладаннямі. Паняцце «вотчына» выпрацоўваецца ў працэсе развіцця гаспадарчага жыцця прававым шляхам; заканадаўчыя акты дзяржавы толькі фіксуюць гэты тып зямельных уладанняў [1, с. *70*]. Па Прывілею 1387 г. вотчынамі лічыліся толькі землі, якія знаходзіліся ў валоданні па даўнасці часу. Яны перадаваліся па спадчыне і не з'яўляліся актам міласці Вялікага князя. Аднак ў працэсе развіцця зямельнага права падобны статус атрымліваюць і зямельныя падараванні ад Вітаўта да Казіміра. І толькі ў канцы XV — пачатку XVI ст. выпрацоўваецца норма, якая дапускае свабоднае распараджэнне вотчыннымі землямі ў памеры 1/3

[6, р. 1, арт. 16, с. *37—38*]. Астатнія землі павінны былі заставацца ва ўласнасці сям'і; яны з'яўляліся для дзяржавы гарантыяй нясення падданымі ваеннай службы [1, с. *122*]. Такім чынам, права прыватнай уласнасці на зямлю і сядзібы замацоўваецца толькі ў XVI ст. [7, с. *233*]. Аднак нават тады яно насіць абмежаваны характар: вотчыну, напрыклад, немагчыма было перадаць па тэстаменце, і пасля смерці ўладальніка пры адсутнасці нашчадкаў яна пераходзіла Вялікаму князю [8, с. *492*].

Асаблівае развіццё на беларускіх землях ў эпоху Вялікага княства Літоўскага атрымлівае ўмоўнае землеўладанне — шырокія раздачы галоўным чынам гаспадарскіх зямель у рукі шляхты пры ўмове нясення перш за ўсё ваеннай, а таксама шэрагу іншых павіннасцяў: замкавай, дарожнай, маставой, падводнай, стацыйнай, вартавой і застаўнай [9, с. *147*]. Пры гэтым формы ўмоўных падараванняў былі самымі разнастайнымі. Яны маглі быць кароткачасовымі («на хлебакармленне») і вярталіся вялікаму князю пасля таго, як шляхціц пераставаў мець патрэбу ў такой падтрымцы. Асабліваe распаўсюджванне ў сярэдзіне XV—XVI ст. атрымалі падараванні «да волі гаспадарскай», якія не забяспечвалі гарантыі працяглага карыстання. Таму ў некаторых выпадках яны ператвараліся ў дачаснае землеўладанне (канец XV — пачатак XVI ст.), пры якім былі загадзя вядомыя тэрміны карыстання. А з пачатку XVI ст. актыўна распаўсюджваецца даніна «да жывата», «да двух жыватоў», якую пазней сталі называць «валоданнем на ленным праве». Асаблівы статус мела «вечыстае» землеўладанне — права свабоднага распараджэння падараванымі землямі пад кантролем вярхоўнай улады; такія землі падлягалі канфіскацыі толькі пры здзяйсненні здрады, крымінальных злачынстваў і па меркаваннях асабістага характару [8, с. *489*].

Гаспадарчы статус заходніх і ўсходніх беларускіх зямель у гэты перыяд істотна адрозніваўся: эканамічна больш развітымі былі заходнія тэрыторыі, здаўна арыентаваныя на гандаль з Еўропай, дзе актыўна развівалася буйное дзяржаўнае і прыватнае землеўладанне. Асаблівае развіццё вялікакняскія ўладанні атрымалі тут пасля 1510 г., калі адпала пагроза крыжакаў і заходнія землі апынуліся бліжэй да знешніх рынкаў збыту [9, с. *121*]. Насельніцтва ўсходніх рэгіёнаў Беларусі займалася прамысловай дзейнасцю, што не патрабавала жорсткага адміністравання і прадугледжвала значную долю самакіравання. Развіццё земляробства тут ускладнялася нізкаўрадлівымі глебамі і частымі памежнымі канфліктамі з Масковіяй, таму буйное дзяржаўнае і прыватнае землеўладанне на ўсходзе не атрымала шырокага распаўсюджвання.

Да сярэдзіны XVI ст. колькасць феадалаў, якія мелі ўладанні на беларускіх землях, складала каля 162 тыс. чалавек, 9 % ад агульнай колькасці насельніцтва (1,8 млн чалавек), або 46 % усіх феадалаў Вялікага княства (350 тыс. чалавек) [10, с. *147*]. Асабісты дамен Вялікага князя сфармаваўся толькі ў эпоху праўлення Жыгімонта II Аўгуста (1548—1572), аднак у гэты перыяд ён складаў амаль 1/2 тэрыторыі дзяржавы [11, с. 184]. Дамен складалі не толькі ворныя, але і іншыя сельскагаспадарчыя і лясныя ўгоддзі. Акрамя таго, на дзяржаўных землях стаялі гарады і мястэчкі. Даходы з уладанняў гаспадара ішлі ў дзяржаўную казну, на ваенныя патрэбы, утрыманне княжацкай адміністрацыі і двара.

Ужо ў Прывілеі Аляксандра 1492 г. [2, с. *46—53*] М. В. Доўнар-Запольскі бачыць размежаванне зямель, якія складаюць уласнасць князя і агульнадзяржаўную ўласнасць: даходы з заходніх зямель Беларусі («гаспадарскіх», «сталовых») ішлі ў асабістую казну караля і Вялікага князя, а ўсходнебеларускія землі («земскія добры») складалі агульнадзяржаўны зямельны фонд [8, с. *170—173*]. Аднак У. І. Пічэта лічыць, што падобнае размежаванне яшчэ вельмі рана для мяжы XV—XVI ст. [1, с. *54*].

Указ Жыгімонта II Аўгуста на імя дзяржаўцаў яго асабістых маёнткаў (20. 07. 1569 г.), падпісаны на Люблінскім сойме, вылучае асабістыя «добры» караля з дзяржаўных і дае іх падрабязны спіс [8, с. *174*]. Канчатковае вылучэнне са складу дзяржаўных уладанняў так званых сталовых зямель, асабістага дамена князя для забеспячэння прыбыткам пасаду, адбылося на каранацыйным сойме 1588 г. у Кракаве (Берасцейскае і Гарадзенскае староства, Камянецкая, Кобрынская, Магілёўская, Аліцкая і Шавельская дзяржавы) [11, с. *261*].

Актыўна развіваліся і прыватнаўласніцкія гаспадаркі: з сярэдзіны XV ст. назіраецца працэс паступовай рэарганізацыі натуральнай панскай гаспадаркі і пераарыентацыя яе на вытворчасць таварнай прадукцыі, у фальваркава-паншчынную. Вялікая колькасць дзяржаўных зямель перайшла ў прыватныя рукі як падараванні князя сваім васалам за верную службу. Да сярэдзіны XVI ст. фонд гаспадарскіх уладанняў скараціўся з 80 % па колькасці падданых (на канец XIV ст.) да 30 %. [11, с. *260*]. У XV—XVI ст. заканадаўча ўмацоўвалася манапольнае права шляхты на зямельную ўласнасць і іншыя прывілеі. Да сярэдзіны XVI ст. у якасці асноўнай формы арганізацыі памешчыцкай гаспадаркі на паўночна-заходніх, найбольш развітых у гаспадарчым плане, землях усталёўваецца фальварак — комплексная гаспадарка, заснаваная на працы прыгонных сялян, прадукцыя якой выраблялася на продаж. Фальваркі былі шматгаліновымі гаспадаркамі з пераважным развіццём раслінаводства (у асноўным жыта, авёс, ячмень), а таксама жывёлагадоўлі (пераважна коней). Акрамя таго, у памешчыцкіх гаспадарках меліся розныя прадпрыемствы па перапрацоўцы сельгаспрадукцыі (млыны, бровары і інш.). Буйныя землеўладальнікі актыўна выкарыстоўвалі і свае прамысловыя ўгоддзі (рыбныя, борці, паляўнічыя). А ўладальнікі буйных лясных масіваў («пушчаў») разгарнулі інтэнсіўную вытворчасць лесаматэрыялаў, попелу і іншай прадукцыі, якая карысталася попытам на знешнім рынку.

Такім чынам, найбуйнейшым землеўладальнікам у XVI ст. з'яўлялася дзяржава. Разам з правам уласнасці асобных феадалаў дзяржаўная ўласнасць складала адзіную феадальную ўласнасць [7, с. *138*]. У першай палове XVI ст. гаспадарская і прыватнаўласніцкая гаспадаркі ў асобнасці ўяўлялі сабой комплексную структуру, развіццё якой вяло да павелічэння вытворчасці сельскагаспадарчай і прамысловай прадукцыі, арыентаванай на ўнутраны і знешні (галоўным чынам буйныя магнацкія і вялікакняжацкія гаспадаркі) рынак. Менавіта сельская гаспадарка забяспечвала асноўную частку даходаў дзяржаўнага скарба, таму ад правільнага кіравання ёй залежаў узровень прыбыткаў гаспадарскіх двароў. У той жа час інвентары пачатку XVI ст. сведчаць аб адсутнасці выразнай сістэмы кіравання дзяржаўнымі маёмасцямі, самаўпраўстве намеснікаў і дзяржаўцаў, якія павінны былі прадстаўляць інтарэсы Вялікага князя ў асобных яго ўладаннях.

Гаспадарчыя ўставы пачатку XVI ст., якія мелі рэгіянальнае значэнне, уяўлялі сабой шэраг указанняў, якія павінны былі паставіць гаспадарскія двары пад кантроль цэнтральнага ўрада і павялічыць іх даходнасць. Ужываліся яны пераважна ў заходніх рэгіёнах Беларусі. Так, Устава 1514 г. распаўсюджвалася на тэрыторыі Віленскага і Трокскага паветаў. Яна, па сутнасці, не ўводзіла новых прынцыпаў кіравання вялікакняскімі ўладаннямі, а толькі фіксавала той парадак, які ўжо склаўся, і патрабавала яго няўхільнага выканання: стварэнне пры гаспадарскіх дварах асобных зямельных надзелаў і прыцягненне для іх апрацоўкі сялян (цяглых), вылучэнне пэўнай колькасці сялян для дваровай службы і перавод астатніх сялянскіх рабочых рук на чынш з аплатай аблогі па 1 капе грошаў у год і ўдзеле ў талоках. Значнае падабенства з першай мела і Устава гарадзенскаму старасце Юрыю Радзівілу, выдадзеная ў тым жа 1514 г. [4, с. *402—403*].

У 1529 г. з'яўляецца новая «Устаўная грамата державцам і ўраднікам каралеўскіх валасцей, прыпісаных да Віленскага і Трокскага замкаў» з 37-мі артыкулаў [5, т. 2, с. *195—199*]. Яна была складзена на аснове пастановы 1514 г. і дзейнічала ў рэгіёне на працягу 20-ці гадоў. Новай у дакуменце была ідэя рацыянальнага выкарыстання рабочай сілы пры апоры на «чэлядзь нявольную» і цяглых сялян (§ 13). Частка чэлядзі садзілася на зямельныя ўчасткі — «прыробкі», іншая мела бонду — рухомую маёмасць (§ 2). Колькасць людзей розных службаў павінна была ўзгадняцца ў адпаведнасці з патрэбамі кожнай канкрэтнай гаспадаркі. Для кантролю за гаспадарчай дзейнасцю дзяржаўца маёнтка штогод прысылаўся княскі пісар (§ 37).

У сярэдзіне XVI ст. значна ўзрос таварны характар вялікакняскай гаспадаркі на знешнім і ўнутраным рынку, куды адпраўляўся ўвесь сабраны ўраджай. У Заходняй Еўропе таксама актыўна рос попыт на збожжавую прадукцыю, якая прывозілася з Вялікага княства Літоўскага. У гэтых умовах інтэнсіфікацыя гаспадаркі становіцца надзённай неабходнасцю. Пры Жыгімонце Аўгусце з'явілася новая гаспадарчая ўстава, больш вядомая як «Наказ старастам і дзяржаўцам». Дакладная дата яе падпісання невядомая; аднак ёсць здагадка, што гэта 1547 г. [12, с. *10—11*]. Новаўвядзенні дакумента сведчаць аб росце таварнага характару сельскай гаспадаркі. Назіраецца тэндэнцыя да скарачэння «чэлядзі нявольнай» і росту цяглага і асаднага насельніцтва з даволі выразнай фіксацыяй павіннасцяў і падаткаў: цяглыя адпрацоўвалі паншчыну ў сярэднім два дні на тыдзень, неслі падводную павіннасць і плацілі дякла і мезлева, прычым загружанасць гэтай катэгорыі рэкамендавалася адпаведна сілам і магчымасцям, а колькасць цяглых вызначалася патрэбамі кожнай канкрэтнай гаспадаркі; астатняе залежнае сялянства плаціла грашовую аблогу, памер якой залежаў ад якасці глебы і матэрыяльнага стану селяніна. У дакуменце аддаецца перавага трохпольнаму севазвароту. Устава 1547 г. забараняла куплю-продаж зямель у дзяржаўных уладаннях [12, с. *10—11*] і раздачу пустак без згоды з гаспадаром, а таксама эксплуатацыю лясной гаспадаркі. Выключэнне складалі падараванні на ўмовах нясення ваеннай службы і паступлення плацяжоў у дзяржаўны скарб [13, с. *102—104*].

Новай рысай гаспадарчага развіцця ўсходнебеларускіх зямель становіцца рост таварнасці сялянскіх гаспадарак: Полацкая рэвізія 1552 г. паказвае, што падаткі гаспадару сяляне плацілі грашыма [1, с. *147*]. Тут фармуюцца асобныя «народнагаспадарчыя арганізмы»: Прыдзвінне, звязанае з Захадам праз гандлёвы порт Рыга, Пінскае Палессе, якое ў гаспадарчым дачыненні мела некаторыя сувязі з Панямоннем, але ў той жа час прадстаўляла сабой адзіны эканамічны рэгіён. Яго эканамічны ўзлёт звязаны з гаспадарчай дзейнасцю маці апошняга з Ягелонаў, каралевы Боны Сфорца (1494—1557). Менавіта яна і правяла ў 1540-х — пачатку 50-х гг. тут, у сваіх уладаннях, першую аграрную рэформу. Мерапрыемствы праводзіліся ў Давыд-Гарадку, Пінску, Клецку і іншых яе ўладаннях. Рэформа праводзілася на падставе спецыяльнай інструкцыі («уставы»); вядомыя рэдакцыі 1549 і 1552 гг. [14, с. *21—42*]. Менавіта тут упершыню быў ажыццёўлены пераход ад калектыўнага да індывідуальнага сялянскага землекарыстання з выразнай фіксацыяй павіннасцяў. Была ўведзена новая зямельная адзінка — валока. Практыка ўвядзення індывідуальнага землекарыстання прыйшла ў Вялікае княства з Польшчы, дзе зямельная адзінка называлася «лан», куды, у сваю чаргу, яна пракралася з германскіх зямель. У працэсе ажыццяўлення рэформы Бона праводзіла праверку шляхецкіх правоў на зямлю і фармавала адзінае поле кожнага свайго фальварка, знішчаючы цераспалосіцу. Уладальнікі цераспалосных надзелаў, якія даказалі правы на зямельны ўчастак, атрымлівалі раўнацэнны на іншым полі.

Асноўнай мэтай аграрнай рэформы сярэдзіны XVI ст. было павелічэнне прыбыткаў землеўладальнікаў («размнажэнне набыткаў») праз рэфармаванне сістэмы землекарыстання і падаткаабкладання сялян. У крыніцах комплекс пазначаных мерапрыемстваў называецца «валочная памера», у гістарычнай літаратуры — «аграрная рэформа». М. В. Доўнар-Запольскі называе яе «сялянскай рэформай». Правядзенню комплексу дзяржаўных мерапрыемстваў папярэднічалі ўставы 1514, 1529 гг. і Наказ старастам і дзяржаўцам, якія фактычна рыхтавалі рэформу. Гаспадарчая дзейнасць Боны ў сваіх уладаннях і хуткая Лівонская вайна (1558—1583) з неабходнасцю дадатковых фінансавых выдаткаў паскорылі пачатак правядзення агульнадзяржаўных мерапрыемстваў на вялікакняжацкіх землях.

Праводзілася аграрная рэформа паводле спецыяльнай інструкцыі, якая не захавалася. Першая («старая») памера была праведзена з пэўнымі парушэннямі, што выклікала неабходнасць у новай рэвізіі. Для гэтага была распрацавана і 01. 04. 1557 г. зацверджана новая інструкцыя — «Устава на валокі» з 57-мі артыкулаў, на падставе якой пачалася суцэльная рэвізія — перагляд папярэдняй памеры [5, с. *214—230*]. Устава была дапоўнена 20. 10. 1557 г., 20. 05., 20. 06., 20.10. 1558 г. [3, т. 3, с. *72—95*]. Рэформа, такім чынам, атрымала тэарэтычнае абгрунтаванне і практычныя ўказанні па прымяненні на месцах. Працэс быў завершаны ў 1568 г. і ахапіў усе гаспадарскія ўладанні заходняй часткі Княства [13, с. *506*].

У 1560 г. аграрныя мерапрыемствы пачаліся ў княжацкіх Падняпроўскіх («рускіх») валасцях, на падставе спецыяльнай «уставы», з улікам сацыяльна-эканамічных асаблівасцяў гэтага рэгіёну. Тэкст інструкцыі не захаваўся, але мяркуючы па захаваных матэрыялах «рэвізіі», яна адрознівалася ад «Уставы» 1557 г. [14, с. *124—144*]. Першымі крокамі рэформы стала «параўнанне грунтаў і пастанова платаў». Асноўнай сутнасцю мерапрыемстваў ва ўсходніх рэгіёнах быў перавод сялян з натуральных павіннасцяў на грашовы чынш. Паколькі фальваркавыя гаспадаркі ў гэтых рэгіёнах развіваліся слаба, сяляне вызваляліся ад цяглых прац [14, с. *142*]. На Падзвінне рэформа не праводзілася, паколькі пад час Лівонскай вайны рэгіён быў акупаваны рускімі войскамі.

З пачатку 60-х гг. XVI ст. прыклад вялікага князя сталі пераймаць прыватныя феадалы, пераважна буйныя, якія мелі развітую гаспадарку, — правядзенне рэформы патрабавала немалых сродкаў. Мерапрыемствы праводзілі на падставе ўласных інструкцый, з «Уставы» 1557 г. феадалы запазычвалі толькі асобныя прынцыпы, бо гэтая прыватная ўстава гаспадара не мела для іх заканадаўчай сілы. Рэарганізацыя маёнткаў дробных і сярэдніх духоўных і свецкіх феадалаў расцягнулася на многія дзесяцігоддзі.

Маштабныя вынікі аграрнай рэформы 1557 г. ужо аналізаваліся [14, с. *71—72*]. Асноўныя прынцыпы землекарыстання і падаткаабкладання сялян, уведзеныя аграрнай рэформай 1557 г., вызначылі істотныя рысы аграрнага ладу Беларусі на працягу далейшых 200 гадоў.

Да канца XIV — пачатку XV ст. эканоміка беларускіх зямель, якія ўваходзілі ў склад Вялікага княства Літоўскага, пры актыўнай падтрымцы дзяржавы, выйшла на новы ўзровень развіцця, які знайшоў сваё адлюстраванне ў пашырэнні таварна-грашовых адносін, станаўленні ўнутранага рынку, пачатку актыўнага ўключэння гаспадаркі ў сферу еўрапейскіх гандлёва-эканамічных сувязяў. Права прыватнай уласнасці на зямлю ў XIV ст. толькі замацоўвалася, ішоў працэс перарастання права феадальнай уласнасці ў права неабмежаванай уласнасці на зямлю. Развіццё гаспадаркі на дзяржаўных землях аказвала значны ўплыў на агульны эканамічны стан краіны. Ішоў працэс фарміравання зямельнага права.

## Літаратура

1. *Пичета, В. И.* История сельского хозяйства и землевладения в Белоруссии / В. И. Пичета. — Минск : Изд. Наркомзема, 1927. — Ч. 1 (до конца XVI в.). — 176 с.

*Picheta, V. I.* Istorija sel'skogo hozjajstva i zemlevladenija v Belorussii [History of agriculture and land tenure in Belarus] / V. I. Picheta. — Minsk : Izd. Narkomzema, 1927. — Ch. 1 (do konca HVI v.). — 176 p.

2. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі ў дакументах і матэрыялах : вуч. дапам. ; пад агул. рэд. праф. А. Ф. Вішнеўскага, Я. А. Юхо. — Мінск : Акад. МУС Рэсп. Беларусь, 1998. — 311 с.

3. Акты, относящиеся к истории Западной России, собранные и изданные Археографической комиссией : в 5 т. — СПб. : Тип. Э. Праца, 1846—1848. — Т. 1—3.

4. Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах : у 4 т. — Менск : Выд-ва АН БССР, 1936. — Т. 1: IX—XVIII стст. — 678 с.

5. Белоруссия в эпоху феодализма: сб док. и материалов : в 3 т. — Минск : Изд-во АН БССР, 1959. — Т. 1 (с древнейших времен до середины XVII в.). — 516 с.

6. Статут Великого княжества Литовского 1529 г. ; под ред. акад. АН Литовской ССР К. И. Яблонскиса. — Минск : Изд-во АН БССР, 1960. — 254 с.

7. *Юхо, Я. А.* Крыніцы беларуска-літоўскага права / Я. А. Юхо ; пад рэд. Т. Ф. Есіпенкі. — Мінск : Беларусь, 1991. — 238 с.

*Juho, Ja. A.* Krynicy belaruska-litoўskaga prava [Sources of Belarusian-Lithuanian law] / Ja. A. Juho ; pad rjed. T. F. Esipenki. — Minsk : Belarus', 1991. — 238 p.

8. *Доўнар-Запольскі, М. В.* Дзяржаўная гаспадарка Вялікага княства Літоўскага пры Ягелонах / М. В. Доўнар-Запольскі. — 2-е выд. — Мінск : Беларус. навука, 2013. — 759 с.

*Dounar-Zapol'ski, M. V.* Dzjarzhaunaja gaspadarka Vjalikaga knjastva Litouskaga pry Jagelonah [State economy Grand Duchy of Lithuania under the Jagelonians] / M. V. Dounar-Zapol'ski. — 2-e vyd. — Minsk : Belarus. navuka, 2013. — 759 p.

9. *Любавский, М. К.* Очерки истории Литовско-русского государства до Люблинской унии включительно / М. К. Любавский. — СПб. : Наука, 2004. — 311 с.

*Ljubavskij, M. K.* Ocherki istorii Litovsko-russkogo gosudarstva do Ljublinskoj unii vkljuchitel'no [Essays on the history of the Lithuanian-Russian state up to and including the Union of Lublin] / M. K. Ljubavskij. — SPb. : Nauka, 2004. — 311 p.

10. Нарысы гісторыі Беларусі : у 2 ч. / М. П. Касцюк [і інш.]. — Мінск : Беларусь, 1994. — Ч. 1. — 527 с.

11. Гісторыя Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. — Мінск : Экаперспектива, 2007—2011. — Т. 2: Беларусь у перыяд ВКЛ / Ю. Бохан [і інш.]. — 2008. — 688 с.

12. *Ленцевич, О. М.* К истории формирования народнохозяйственного комплекса Беларуси: эпоха Великого княжества Литовского / О. М. Ленцевич // Инновац. образовател. технологии. — 2017. — № 1 (49). — С. 67—73.

*Lencevich, O. M.* K istorii formirovanija narodnohozjajstvennogo kompleksa Belarusi: jepoha Velikogo knjazhestva Litovskogo [To history of national economic complex formation in Belarus: era of Grand Duchy of Lithuania] / O. M. Lencevich // Innovac. obrazovatel. tehnologii. — 2017. — N 1 (49). — P. 67—73.

13. *Пичета, В. И.* Аграрная реформа Сигизмунда-Августа в Литовско-Русском государстве / В. И. Пичета. — М. : Изд-во АН СССР, 1958. — 545 с.

*Picheta, V. I.* Agrarnaja reforma Sigizmunda-Avgusta v Litovsko-Russkom gosudarstve [Agrarian reform of Sigismund-Augustus in the Lithuanian-Russian state] / V. I. Picheta. — M. : Izd-vo AN SSSR, 1958. — 545 p.

14. *Пичета, В. И.* Белоруссия и Литва в XV—XVI вв. Исследования по истории социально-экономического, полит. и культур. развития / В. И. Пичета. — М. : Изд-во АН СССР, 1961. — 812 с.

*Picheta, V. I.* Belorussija i Litva v XV—XVI vv. Issledovanija po istorii social'no-jekonomicheskogo, polit. i kul'tur. Razvitija [Belarus and Lithuania in the XV — XVI-th centuries. researches on the history of social economics, polit. and cultures. development] / V. I. Picheta. — M. : Izd-vo AN SSSR, 1961. — 812 p.

**VOLGA LIANTSEVICH**

## *LEGAL REGULATION OF LAND RELATIONS IN THE BELARUSIAN LANDS IN THE PRIVILEGED PERIOD (XIV — FIRST HALF OF XVI CENTURY)*

**Author affiliation.** *Volga LIANTSEVICH* (liantsevich.volga@yandex.ru), *Belarus State Economic University (Minsk, Belarus).*

**Abstract.** Based on the analysis of the national privileges of the XIV—XVI centuries, as well as other sources of law of the Grand Duchy of Lithuania, the article reveals the growing role of the state in the legal regulation of land relations.

**Keywords:** privilege; szlachta (gentry); magnates; patrimony; conditional land ownership; domain; lord's manor; folwark; economic charters; «felling size».

**UDC** 433

*Статья поступила*
*в редакцию 26. 01. 2021 г.*

**В. И. ЕРМОЛОВИЧ**

## *ЮРИДИЧЕСКОЕ ЛИЦО В ПРАВЕ ДРЕВНЕГО РИМА И СРЕДНЕВЕКОВОЙ СЕРБИИ*

### *(Часть 2. Начало в № 4 2021 г.)*

В статье на основе многопланового анализа источников римского частного права и юридических источников средневековой Сербии X—XV вв. исследуется становление и развитие института юридического лица в праве Древнего Рима и средневековой Сербии. Автор проанализировал историю создания, структуру и содержание понятия юридического лица в эпоху Древнего мира и Средневековья, а также особенность механизма рецепции структурных элементов юридического лица в праве Древнего Рима и средневековой Сербии, которые оказали существенное влияние на формирование современного гражданского права стран романо-германской правовой системы.

**Ключевые слова:** юридическое лицо; римское частное право; Средневековье; Сербия.

**УДК** 34 (37) 091 : 347.4 (09) (4)

*Виктор Иванович ЕРМОЛОВИЧ* (jermalovich7@gmail.com), *кандидат исторических наук, доцент кафедры международного экономического права Белорусского государственного экономического университета (г. Минск, Беларусь).*